Гродна /

# Сябруем з усімі

**У 2011 годзе супрацоўнікі аддзелаў абслугоўвання Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага сталі на Гродзеншчыне першапраходцамі ў правядзенні выязных дзён інфармацыі на прадпрыемствах і ў арганізацыях Гродна.**

Работнікі гэтых устаноў, аднойчы скарыстаўшыся паслугамі бібліятэкі, ацанілі на практыцы выгаду і аператыўнасць новага сэрвісу. Кіраўнікі



Падчас кніжнай выстаўкі ў Гродне.



Юрый Жэрко (другі злева) з ацёрамі "Майстэрні ўраджанняў".

задавальненнем выбіраюць літаратуру, знаёмяцца з навінкамі, прапануюць яе сваім падначаленым.

Як паказаў час, такія мерапрыемствы сталі запатрабаванымі, і 12 буйнейшых прадпрыемстваў горада, сярод якіх — ААТ "Радыёхваля", ААТ "Малочны свет", ААТ "Гранітэкс", ААТ "Гродзенскі мясакамбінат", ААТ "БелТАПАЗ", РУП "Гроднахлебпрам", СП ТАА "Дынама-Програм" і інш., заключаюць дагаворы на інфармацыйнае абслугоўванне на пастаяннай аснове.

Супрацоўніцтва бібліятэкі з працоўнымі калектывамі цягам апошняга года стала набываць тэматычны характар. Напрыклад, былі арганізаваны выстаўкі — "Мама, мамачка, матуля", "Да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне", "Гродна ў гады вайны ў фотаздымках 1941-1945 гг.", "16 ліпеня — Дзень вызвалення Гродна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў" і г.д.

юць прагляды літаратуры па гісторыі Гродна з паказам відэаролікаў, якія арганізуюцца сумесна з вядомымі гродзенскімі краязнаўцамі і калекцыянерамі В.Саяпіным і Я.Парулісам.

Акрамя выязных дзён інфармацыі бібліятэка прымае ўдзел у правядзенні адзіных дзён інфармавання. У прыватнасці, былі арганізаваны прагляды літаратуры на тэмы: "Актуальныя пытанні пенсійнага забеспячэння насельніцтва"; "Пра вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Гродзенскай вобласці ў 2014 годзе"; "Саюзная дзяржава: праблемы і перспектывы"; "Пра праблемы насілля ў сям'і" (у рамках Рэспубліканскай прафілактычнай акцыі "Дом без насілля"); "Пра меры папярэджання пажараў і іншых надзвычайных сітуацый у Гродзенскай вобласці" і іншыя.

Прыемна адзначыць, што работнікі прадпрыемстваў не толькі чакаюць, калі да іх прыедуць нашы супрацоўнікі, але і самі прыходзяць у бібліятэку. І хочацца спадзявацца, што выязныя дні інфармацыі дапамогуць у фарміраванні культуры чытання насельніцтва, а бібліятэка стане ключавой крыніцай атрымання інфармацыі.

**Алена ПАТАПАВА,**
**Алена СЕМЯНЮК,**
**бібліятэкары аддзела абанемента Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага**